Д. Я. Дрозд (г.Мінск, Беларусь)

# ВОБРАЗЫ ПРЫРОДНЫХ З’ЯЎ У БЕЛАРУСКАЙ ВЯСЕЛЬНАЙ СІМВОЛІЦЫ

У вясельнай сімволіцы беларусаў значнае месца займаюць вобразы, якія абазначаюць з’явы прыроды. Нашы далёкія продкі не толькі абагаўлялі прыроду, але і адчувалі моцную, жыццёва неабходную сувязь з ёю. Анімізм надаў з’явам прыроды знешняе і ўнутранае падабенства з чалавекам: «У патаемных прадказаннях прыроды, у яе спакойна-ўрачыстых і грозных праявах бачыў ён адзін вялікі цуд, слова «боства», якое вылецела з яго вуснаў, абняло сабою ўсё багацце розных натуральных сілаў і вобразаў» [1, с. 94].

Найчасцей ужываюцца назвы такіх з’яў, як раса, дождж, снег, іней, туман, вецер. У тэкстах сустракаем выразы: «А на маём дзіцяці белая іней (бель, вапна) пала, усю галоўку заслала», у якіх іншасказальна гаворыцца пра хустку ці вэлюм, якім пакрываюць галаву дзяўчыны.

Вяселле – важная падзея ў жыцці маладых і іх родаў, а таму па дапамогу звярталіся да незямных сілаў, прыродныя з’явы лічылі адказам апошніх на просьбы. У хрысціянскай тэалогіі іней і раса сімвалізуюць адраджэнне, звязаны з ідэяй смерці дзеля жыцця (аналогія з абрадам ініцыяцыі).Расу разглядаюць і як сімвал слова Божага, калі яно «праступае» ў сэрцах веруючых, пераконвае іх. У вясельных песнях дождж і раса – гэта і слёзы маладой:

Маладая дзеванька
Да сонца ўставала
З руты да расу брала,
Расою умывалася,
Да шлюбу прыбіралася [2, с. 390].

Звязаная с дажджом (снегам, інеем) ідэя апладнення зямлі нарадзіла семантыку вобраза: дождж і снег, падаючы на зямлю, садзейнічаюць добраму ўраджаю і прыплоду жывёлы, а значыць і багаццю, дабрабыту, увогуле жыццю. На Беларусі здаўна існуе павер’е: калі пладовыя дрэвы ці жывёла пакрыюцца інеем, то будзе багаты ўраджай ці прыплод.

Туман разам з хмарай і воблакам у міфалагічнай і біблейскай сімволіцы абазначаюць скрытнасць, таямнічасць. У кнігах Бібліі боства часта ўзнікае з воблака («стаўба воблачнага») ці туману. Акрамя гэтага, туман, як і хмарнасць, служыць вобразам гора і смутку:

Хмурыцца на дварэ, хмурыцца,
Ганнулькі мамулька журыцца:
Бірагла дачушку, як вока,
А цяпер отдаець далёка[2, с. 158].

Выкарыстанне гэтых вобразаў у вясельнай паэзіі можна растлумачыць той таямнічасцю, з якой ажыццяўляецца з’яднанне дзвюх асоб. Нездарма ў народзе кажуць, што шлюб, як і лёс, прадракаецца на нябёсах, незалежна ад чалавечага жадання: «Будзе тое, што суджана», «Нарачонага не абойдзеш»,«Калі Бог злучыць, то ніхто не разлучыць».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пакаціўся туман
Да па загор’ечку.
Кланяйся, Ганначака,
Да па застоллечку [2, с. 562].

Неадназначным паўстае вобраз ветру. З аднаго боку, ён абазначае злыя сілы, здольныя патушыць сямейны агонь ці свечку(як сімвалы жыцця і шчасця), прыцярушыць маладых пылам (увасабленне няшчасця, смутку):

А павей, ветрык, па двару,
Аж пад новую камору.
А ў той каморы нікога –
Адна Ганулька сядзела,
Перад ёй свечка гарэла.
Прыйшла да яе мамачка:
– Адчыніся, дачушка.
– Я не адчынюся-баюся,
Каб ветрык свечкі не згасіў,
Каб дождждык коскі не зрасіў [2, с. 424].

У народных павер’ях вецер –стварэнне нячыстай сілы. Разам з ветрам паводле ўяўленняў нашых продкаў, лётаюць душы памерлых. Так у песнях бацькі-нябожчыкі прыходзяць на вяселле дачкі ў выглядзе «ветрыка ціхага» ці хмаркі, якая «дождждыкам аблівае» маладых, г. зн. «долечкаю-шчасцем» дорыць.

Другая роля ветру – гэта роля памочніка. У сірочых песнях маладая звяртаецца да «ветрыка хуткага» з просьбай раздзьмуць-развеяць «пясочак жоўценькі», зламаць «дошкі дубовыя» і вызваліць з «таго свету» памерлых бацькоў.

Атмасферныя з’явы здаўна надзяляліся сувяззю з «тым» светам. Вецер лічылі месцам знаходжання душаў памерлых. Беларусы верылі, што калі хто-небудзь скончыць жыццё самагубствам, то ўзнікаюць бура, град. Для ратавання ад іх выкарыстоўвалі такія ж сродкі, як і для абароны ад нечысці: царкоўныя свечкі, асвечаныя зёлкі і інш.

У вясельных песнях мыццё, купанне, пападанне пад дождж, збіранне расы, абазначаюць каханне і хуткае вяселле.

З сенажаці вада плыве,
Малада Манечка,ногі мые.
– Ой, мой жа, Манечка,бялюсенька,
Ужо твае вянчанечка блізюсенька [2, с. 392].

Невядомасць перад сямейным жыццём праяўляецца ў песнях, дзе замужжа параўноўваецца з пераходам праз ваду (раку, мора, возера, балота), ці гібеллю ў моры, віры, балоце, якія паглынаюць, топяць у паўсядзённых клопатах і цяжкасцях.

Мясцовасць, дзе жыве будучы муж дзяўчыны, часта рэзка супрацьстаўляецца з роднымі мясцінамі маладой: «там горы высокія», «пяскі жоўтыя», «балоты топкія», «вятры дуюць буйныя», «град б’е бязлітасны».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Садовая наша яблынька,
Адсадзілі цябе ад саду.
У тыя горы крутыя,
У тыя пяскі жоўтыя [3, с. 131].

Здольнасць нашых продкаў падсвядома пераўтвараць аб'екты ці формы навакольнага свету ў сімвалы, надзяляць іх вялікім псіхалагічным значэннем, з'яўляецца не толькі адной з важнейшых асаблівасцей іх мыслення, але і сведчаннем высокай ступені развіцця паэтычных здольнасцей.

## Літаратура

1.Абрамян, Л. А. Первобытный праздник и мифология / Л. А. Абрамян. – Ереван, 1983. – 189 с.
2. Вяселле. Песні : у 6 кн. – Мінск : Нав. і тэхніка, 1981. – Кн. 2. – 831 с.
3. Вяселле.Песні : у 6 кн. – Мінск : Нав. і тэхніка, 1988. – Кн. 5. – 708 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ